Кантэкст

# «ПАЖЫЛЫ ВАЙСКОВЕЦ УДАРЫЎ НЕКАЛЬКІ РАЗОЎ НАГОЙ У ЖЫВОТ»

## Збітая польскімі сілавікамі жанчына страціла дзіця

**На лініі беларуска-польскай граніцы 25 кастрычніка пагранічны нарад заўважыў групу бежанцаў, якія прасілі аб дапамозе. Сярод іх была жанчына ў цяжкім стане. Пра гэта паведамілі ў Дзяржпагранкамітэце.**

«Па словах яе сына, яны знаходзіліся на тэрыторыі Польшчы і там запыталі статус бежанцаў. Замест разгляду прашэння польскія сілавікі пагрузілі іх у аўтамабіль і прывезлі на граніцу з Беларуссю. Бежанцам пагражалі і прымянялі фізічную сілу, каб прымусіць парушыць граніцу ў Беларусь. Пры гэтым цяжарную жанчыну некалькі разоў ударылі нагой у жывот. Як распавёў яе сын, гэта зрабіў на вачах у яе родных «пажылы польскі вайсковец з адной зоркай на пагонах». Ад гэтага ў жанчыны адкрыўся крывацёк», — распавялі ў ДПК. Толькі ўявіце сітуацыю! Нічога не нагадвае?

Брэсцкія пагранічнікі неадкладна выклікалі хуткую дапамогу, якая даставіла пацярпелую ў Камянецкую раённую бальніцу. Там жанчыну абследавалі і аказалі неабходную дапамогу. Цяпер яе стан ацэньваецца як сярэдняй ступені цяжкасці. На жаль, з прычыны атрыманых траўм жанчына страціла дзіця.

«Жорсткасць спараджае жорсткасць. Польскія пагранічнікі паказваюць кадры, як бежанцы ідуць праз загароды, а не стаяць, як раней, на лініі граніцы і не ўмольваюць даць ім магчымасць падаць прашэнне аб прыстанішчы, пры гэтым самі польскія ўлады спрабуюць дэманізаваць бежанцаў і ствараюць карцінку пра нібыта агрэсіўныя дзеянні іншаземцаў, аднак прычына зусім не ў бежанцах, якія страцілі надзею прасіць і чакаць. Збіваюць людзей, выкідваюць іх у лесе без ежы і адзення. Узнікае рытарычнае пытанне да краін ЕС: якіх адносін вы чакаеце? Дык, можа, зваротная рэакцыя бежанцаў на прыніжэнне з боку ЕС цалкам заканамерная?» — дадалі ў ведамстве.

Тое, што адбываецца ў Літве і Польшчы з мігрантамі, нагадвае запушчаны ў гэтых краінах механізм эскалацыі крызісу і глыбокай трансфармацыі ўлады. Такім меркаваннем з падпісчыкамі свайго тэлеграм-канала падзяліўся **палітолаг Юрый ШАЎЦОЎ,** паведаміла БелТА. «На граніцы спробы прарываў бежанцаў натоўпамі сталі нормай. Гляджу відэа: калі польскія пагранічнікі не перашкаджаюць, у бежанцаў паваліць агароджу з калючым дротам займае хвілін пяць. Можна і хутчэй. Трубы, на якія спіраль мацуецца, не забетанаваны. Ці часта не забетанаваны, іх проста выдзіраюць з зямлі рукамі. Такой імітацыйнай барацьбы з мігрантамі наогул вельмі шмат. І вось гэта адкрытая імітацыйнасць барацьбы з міграцыйным крызісам і ёсць самае цікавае ў ім», — адзначыў эксперт. Ён дапускае, што гэта можа быць націскам на Германію і ўсю Старую Еўропу з боку Польшчы, Літвы і Латвіі. «Каб грошай далі. Там на коне толькі для Польшчы 24 мільярды еўра. Ці нешта ў Германіі і самім Бруселі. Дзейсныя ж меры для барацьбы з мігрантамі існуюць. Яны проста не запускаюцца», — канстатаваў Юрый Шаўцоў.

Каментуючы планы Польшчы па адпраўцы яшчэ 10 тысяч ваенных на барацьбу з бежанцамі плюс да пагранічнікаў і паліцыі, Юрый Шаўцоў называе гэта цэлай парадыслакацыяй войскаў непасрэдна да граніцы. «Гэта значыць, непасрэдна да Брэста і Гродна. Але наўрад ці гэта будзе само па сабе эфектыўным. Цяпер і так задзейнічана амаль 7 тыс. ваенных. Асаблівага толку ад іх, як бачым, паводле даных статыстыкі па бежанцах у Германіі, няма. Прарывы вялікімі групамі ідуць кожны дзень, ужо ёсць польскія параненыя. Калі на прарыў пойдуць натоўпы 1000—5000 чалавек, яны дадуць такую карцінку для СМІ, што ніякая армія палітыкам потым не дапаможа, — падкрэсліў палітолаг. — Пакуль усё, што адбываецца ў Літве і Польшчы з іміграцыйным крызісам, нагадвае запушчаны ў гэтых краінах механізм эскалацыі крызісу і глыбокай трансфармацыі ўлады. Можа, размова ідзе аб пераварот, гэта значыць аб змене ўлады. А можа, і аб радыкальным узмацненні палітычнага рэжыму».

Таксама Юрый Шаўцоў не выключыў, што, калі афганскіх бежанцаў зімой стане шмат, яны абавязкова паспрабуюць асвоіць Украіну. «Афганцаў хопіць на ўсіх. Але Украіна асабліва не абаронена для ператварэння ў транзітную краіну з-за шэрагу асаблівых фактараў. У Польшчы відавочна стала на ногі буйная індустрыя трафіку людзей у Германію. Гэтай індустрыі ўсё роўна, адкуль вазіць бежанцаў праз Польшчу. Украіна мае вялікую граніцу з Польшчай — гэта натуральны канал для такой індустрыі. Прэцэдэнтаў такога транзіту становіцца ўсё больш. Прычым асабліва прыкметныя менавіта афганцы. Хутчэй за ўсё ёсць нейкі ўнутраны ўкраінскі фактар, чаму праз яе ідуць менавіта яны. Напярадзе ва Украіны складаная зіма. Калі не будзе энергіі і газу, структуры дзяржкіравання павінны будуць аслабець — самае тое для крымінальнага трафіку людзей», — рэзюмаваў аналітык.

**Пётр ДУНЬКО.**

# ЯК НЕ СТАЦЬ АХВЯРАЙ АГНЮ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Згубная звычка магла стаць фатальнай і для 18-гадовага хлопца з Віцебска. Паведамленне аб пажары ў прыватным сектары ратавальнікам паступіла ноччу. Як расказаў **начальнік змены Аляксандр ДУБІН,** калі яны прыбылі на месца, звонку дома ні дыма, ні агню не было відаць. «Каля хаты стаяў малады чалавек, ён сказаў, што ўнутры ёсць яшчэ адзін, — згадвае супрацоўнік МНС. — Мы з калегамі, падключыўшыся да апаратаў на сціснутым паветры, увайшлі ў хату. У адным з пакояў гарэла канапа, было шчыльнае задымленне, а на падлозе ў кухні мы ўбачылі чалавека. Ён быў у прытомнасці, аднак у неадэкватным стане: візуальна быў вельмі п'яны і выйсці з небяспечнай зоны самастойна не мог».

Да прыезду ўрачоў ратавальнікі аказалі маладому чалавеку першую медыцынскую дапамогу.

Супрацоўнікі МНС працуюць і на прафілактыку: тлумачаць людзям, як пазбегнуць пажару, а таксама як сябе паводзіць, калі адбылося здарэнне.

### Печ патрабуе клопату

Амаль кожны трэці пажар сёння адбываецца з-за няспраўнасці і парушэння правілаў мантажу печаў, а таксама цеплагенерыруючых агрэгатаў. Часта ўзгаранні становяцца вынікам няспраўных электрасетак і электраабсталявання, іх няправільнай эксплуатацыі.

Менавіта з-за апошняга адбыўся пажар на тэрыторыі аднаго з прыватных падворкаў у гарадскім пасёлку Крывічы, што ў Мядзельскім раёне. Агонь пашкодзіў сцяну гаража і маёмасць, якая ў ім знаходзілася. На шчасце, абышлося без пацярпелых.

Хэпі-эндам скончылася і ўзгаранне жылога дома ў вёсцы Каралёў Стан, якая знаходзіцца недалёка ад сталіцы. Калі ратавальнікі прыехалі на выклік, адванапавярховая драўляная хата гарэла адкрытым полымем. Гаспадар, які своечасова паспеў выйсці са свайго дома, атрымаў тэрмічныя апёкі. Па папярэдняй версіі, пажар адбыўся з-за парушэння правілаў эксплуатацыі печы.

— Ацяпляльны перыяд толькі пачаўся, але, на жаль, ужо фіксуюцца пажары, звязаныя з «рытуаламі» абагравання: дзесьці падводзіць своечасова неадрэмантаваная печ, у пэўных выпадках гаспадары вырашылі сагрэцца адзін раз, але так, што перагравання не вытрымалі слабыя месцы, а хтосьці грэбуе правіламі выкарыстання адкрытага агню, — заўважае **афіцыйны прадстаўнік Мінскага абласнога ўпраўлення Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Анастасія ШВАЙБОВІЧ.** — Пры эксплуатацыі пячнога ацяплення трэба быць надзвычай асцярожнымі. Неабходна выкарыстоўваць дровы, якія не выступаюць за межы апалавай камеры. Нельга распальваць печ вогненебяспечнымі і гаручымі вадкасцямі, паліць у ёй трэба два-тры разы на дзень з інтэрваламі, каб не дапусціць перагравання. Печ не павінна мець расколін, комін у межах гарышча неабходна пабяліць. Завяршаць паленне трэба не пазней чым за дзве гадзіны да сну. Зачыніць засланку коміна можна толькі пераканаўшыся, што вугаль поўнасцю прагарэла.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота з архіва Мінскага абласнога ўпраўлення МНС.**

**Каб не дапусціць пажару падчас курэння, варта прытрымлівацца правілаў пажарнай бяспекі:**

✓ нельга курыць у ложку, тым больш калі вы ў стане алкагольнага ап'янення;

✓ нават патушаныя цыгарэты нельга выкідваць з вокнаў або балконаў, а таксама ў вядро са смеццем, дзе ўжо знаходзяцца папера і іншыя гаручыя адходы;

✓ не варта ў якасці попельніцы выкарыстоўваць папяровыя скруткі, пачкі ад запалак або цыгарэт;

✓ сачыце за тым, каб запалкі або цыгарэты не траплялі ў рукі да малых дзяцей.

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Нігерыя ўвяла ў абарачэнне ўласную лічбавую валюту

Яна стала першай краінай у Афрыцы, Цэнтральны банк якой выпусціў сваю «лічбу». Аб гэтым паведаміў прэзідэнт Нігерыі Мухамаду Бухары, абвясціўшы аб запуску і-найры (eNaira) — лічбавага аналага нацыянальнай валюты найры, паведаміла ТАСС. Ён падкрэсліў, што яе з'яўленне надасць новы імпульс не толькі нацыянальнай, але і ўсёй афрыканскай эканомікі. Лічбавая найра не з'яўляецца крыптавалютай. Усе транзакцыі кантралююцца ўладамі, якія рэгулююць фінансавы рынак. Яе курс прывязаны да нацыянальнай валюты Нігерыі, таму яна не можа выкарыстоўвацца як спекуляцыйны інструмент. Як адзначае агенцтва France-Presse, рашэнне выпусціць лічбавую валюту выклікана жаданнем скараціць абарачэнне ў краіне «крыпты», транзакцыі якой не паддаюцца кантролю. Нігерыя займае трэцяе месца ў свеце па аб'ёме нацыянальнага крыптавалютнага рынку.

### Больш за 1,7 млн нелегальных мігрантаў затрымана на граніцы ЗША з Мексікай

Колькасць бежанцаў, затрыманых на паўднёвай граніцы ЗША за мінулыя 12 месяцаў, пабіла рэкорд 20-гадовай даўнасці, калі граніцу спрабавала нелегальна перасекчы больш як 1,6 мільёна чалавек. Трапіць у Штаты спрабавалі грамадзяне звыш 160 краін. Большасць мігрантаў прыйшла з Мексікі, Гватэмалы, Гандураса і Сальвадора. У асноўным гэта людзі сярэдняга ўзросту — больш за 1,1 млн чалавек. Пры гэтым, паводле даных амерыканскіх улад, граніцу спрабавала перасекчы рэкордная колькасць дзяцей без суправаджэння дарослых — больш за 145 тыс. Як паведамляе пагранічна-мытная служба ЗША, больш за палову затрыманых было дэпартавана назад у свае краіны.

### Мінулы год стаў самым гарачым у Азіі за ўвесь час назіранняў

Пры гэтым высокія тэмпературы спрыялі стыхійным бедствам і сур'ёзным эканамічным стратам, паведаміла The Guardian са спасылкай на даклад Сусветнай метэаралагічнай арганізацыі (СМА) ААН. «Катаклізмы надвор'я і кліматычныя змены ў Азіі ў 2020 годзе сталі прычынай гібелі тысяч людзей, прывялі да таго, што мільёны людзей пакінулі свае дамы. Яны абышліся ў мільярды долараў страт за кошт моцнага ўрону інфраструктуры і экасістэмам», — адзначаецца ў дакладзе. Паводле даных СМА, зафіксаваныя летась тэмпературы апынуліся вышэйшыя на 1,39 градуса па Цэльсіі ў параўнанні з паказчыкамі 1981—2010 гадоў. У абсалютных паказчыках найбольшыя эканамічныя страты панёс Кітай — $238 млрд, за ім — Індыя з $87 млрд, Японія з $83 млрд і Паўднёвая Карэя з $24 млрд. А з улікам памеру эканомік больш за ўсё пацярпелі Таджыкістан, страты якога, як чакаецца, склалі 7,9 % ад ВУП, Камбоджа — з 5,9 % і Лаос — з 5,8 %.

**Калектыў Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь выказвае спачуванні кансультанту ўпраўлення эканомікі і фінансаў Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь Трасцянку Леаніду Здзіслававічу ў сувязі са смерцю БАЦЬКІ.**